
Нераўнадушныя да чужога цярпення

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
09.10.2016 00:00



Амаль 10 гадоў у Гродне дзейнічае Душпастырства службы аховы здароўя. Супольнасць аб’ядноўвае дактароў, фельчараў, медыцынскіх сясцёр, акушэраў, лабарантаў, фармацэўтаў і выкладчыкаў горада. Члены душпастырства рэгулярна сустракаюцца разам, каб абмяркоўваць важныя хвалюючыя пытанні. А іх у працы медыка дастаткова. Часам бліжэй, чым святар

Душпастырства службы аховы здароўя г. Гродна існуе з 2007 года. Ініцыятарам і заснавальнікам супольнасці з’яўляецца кс. Андрэй Радзевіч. Святар апекаваўся ёй на працягу 4-х гадоў. З лістапада 2011 года душпастырам быў кс. Мікалай Ціхановіч. З верасня 2015 года па сённяшні дзень ім з’яўляецца кс. Віталій Сідорка. “Любы від дзейнасці чалавека бласлаўлёны Панам, і кожны пакліканы да рэалізацыі пэўных Божых намераў, – зазначае кс. Віталій. – Таму духоўная апека над людзьмі жыццёва неабходная, асабліва над тымі, хто сутыкаецца ў сваёй прафесійнай дзейнасці з экстрэмальнымі сітуацыямі. У гэтым ліку і медыкі, якія маюць справу з хворымі, болем, цярпеннем і нават смерцю. Часамі яны могуць бліжэй падысці да чалавека, чым святар. Калі няма свядомасці, што хворы – гэта бліжні, а дапамога яму – заданне ад Бога, то і падыход да працы зусім іншы”. †



Апекуны душпастырства – святыя Касма і Дам’ян, лекары і цудатворцы. Два браты, якія бескарыслівa лячылі хворых, не чакаючы ніякай узнагароды. “Некаторыя медыкі трапляюць у сітуацыі па-за катэгорыі «нармальнасці», – гаворыць кс. Віталій. – Такія выпадкі можна ахарактарызаваць адным словам – цуд. Многія праз гэта навяртаюцца. Але адразу хачу зазначыць, што большасць урачоў, якіх я спатыкаў, на шчасце, веруючыя”.

У склад душпастырства ўваходзіць каля 50-ці ўдзельнікаў, якія рэгулярна прыходзяць на сустрэчы. Сярэдні ўзрост членаў супольнасці – 40-45 гадоў.

Усяго ў горадзе больш за тысячу медыцынскіх работнікаў. Але, як відаць, толькі

паўсотні шукаюць духоўнай падтрымкі ў хрысціянскай супольнасці. Не хапае часу? “Мабыць, няма свядомасці, што душпастырская апека жыццёва неабходная, – тлумачыць кс. Віталій. – Служэнне медыкаў выходзіць па-за межы прафесіі, бо яны выконваюць надзвычайную місію. Кожнае спатканне з хворым – выключна індывідуальная справа. Часамі здараюцца непрадбачаныя абставіны, да якіх персанал не падрыхтаваны. Ды і самая, здавалася б, простая акалічнасць можа скончыцца нечакана... Канешне, па-людску я разумею: каласальная занятасць, пасля працы хочацца адпачыць. А прыйсці на спатканне, выдзяліўшы некалькі гадзін з адзінага выхаднога ў нядзелю, – сур’ёзны высілак. Аднак мне б усё ж вельмі хацелася, каб удзельнікаў гэтых сустрэч было больш”.

Галоўнае – не нашкодзіць

Штомесячна члены супольнасці збіраюцца на сумесную св. Імшу, пасля якой адбываецца спатканне. Да ўвагі ўдзельнікаў душпастыр прапануе даклады на тэмы, звязаныя з духоўнасцю як урача, так і пацыента. “Некаторыя праблемы выходзяць па-за межы медыцынскай кампетэнцыі, – падкрэслівае кс. Віталій. – Як, напрыклад, ставіцца да цярпення чалавека, яго болю, трагедыі? Чаму асоба можа цярпець і пры гэтым радавацца альбо быць удзячнай? Прапаную разважанні Касцёла на гэты конт”.

Андрэй Аслаўскі згаджаецца з тым, што любое цярпенне становіцца для чалавека выпрабаваннем, таму хворага вельмі важна падтрымліваць, падбадзёрваць. З боку медыка ў дадзеным выпадку патрабуецца асаблівая ўвага і цярплівасць. “Галоўнае – памятаць аб першай запаведзі медыка – не нашкодзь”, – запэўнівае Андрэй. “У размове з пацыентамі я імкнуся данесці, што Бог міласэрны і Ён не пакідае чалавека ў цярпенні, – гаворыць Тарэза Банцэвіч. – Заахвочваю чытаць Біблію, дзе можна знайсці адказы на ўсе хвалюючыя пытанні”.



Апошнія 2 гады члены душпастырства разважалі на спатканнях над вучэннем Катэхізіса Каталіцкага Касцёла. Падымаліся такія пытанні, як эмацыйны складнік у прафесійнай дзейнасці медыка, люд- ская няўдзячнасць, пачуццё неспакойнага сумлення. “Часам медыкі хвалююцца, што ў іх няма суперажывання да хворага, – гаворыць кс. Віталій. – Лічаць гэта сваім недахопам. Але чаму? Справа, перш за ўсё, у тым, што чалавек «выгарае». Я тлумачу, што асоба фізічна не можа спачуваць кожнаму хвораму, калі іх вельмі шмат. Заахвочваю не браць усё блізка да сэрца і галавы: суперажыванне павінна быць не толькі на эмоцыях, але ў першую чаргу на ўзроўні

добрай і якаснай дапамогі пацыенту”.

Караліна Бутоліна прызнаецца, што ў душпастырстве ўпершыню задумалася над пытаннямі біяэтыкі. “Такую дысцыпліну не выкладаюць у медуніверсітэце, – сцвярджае яна. – Змяніла сваё стаўленне да кантрацэпцыі, ЭКА. Тут я атрымліваю шмат важнай і карыснай інфармацыі, якая натхняе мяне і дапамагае ў жыцці і прафесіі”.

Курс на паглыбленне веры

На працягу 3-х апошніх гадоў у Лідзе і Гродне праходзяць Дыяцэзіяльныя сустрэчы работнікаў службы аховы здароўя, прысвечаныя актуальным медыцынскім праблемам. У Адвэнце адбываюцца традыцыйныя рэкалекцыі, калі ўдзельнікі маюць магчымасць засяродзіцца на сваім духоўным стане. У час Божага Нараджэння – аплатковая сустрэча. У мінулым годзе члены душпастырства ўдзельнічалі ў рэкалекцыях, якія арганізоўвала Агульнапольскае душпастырства медыкаў у Чанстахове (Польшча). У планах – рэгулярныя выезды на такія рэкалекцыі.



Для сумеснай інтэграцыі звычайна ладзяцца пілігрымкі. Члены душпастырства пабывалі разам у Ліхэні і Чанстахове (Польшча), Вільнюсе (Літва), Асізі, Падуі, Рыме (Італія). У 2010 годзе прымалі ўдзел у агульнай аўдыенцыі медыкаў з папам Бенедыктам XVI.

Амаль год таму па ініцыятыве ўдзельнікаў была арганізавана дабрачынная акцыя. Пры падтрымцы дыяцэзіяльнага “Карытас” члены душпастырства набылі невялікія падарункі і наведалі старэйшых медыкаў, якія ўжо не прыходзяць на сустрэчы. А на Сусветны дзень хворага і ўспамін Маці Божай з Лурд збіраліся разам на супольнай св. Імшы ў Гарадской бальніцы №2.

У гэтыя дні адбылася першая сустрэча мясцовага душпастырства службы аховы здароўя ў Лідзе. Цяпер і там медыкі будуць мець штомесячныя спатканні. Усе разам плануюць збірацца на дыяцэзіяльных сустрэчах.

Апека над медыкамі-студэнтамі

Караліна Бутоліна прапануе ўзгадаць словы св. Маці Тэрэзы: “Важна не тое, што мы робім, а тое, колькі любові мы ў гэта ўкладваем. Усе мы павінны стаць святымі. Кожны на тым месцы, куды паслаў Пан”. Яна ўпэўнена, што медык пакліканы служыць людзям, браць на сябе адказнасць за іх здароўе і жыццё. А гэта немагчыма без любові да абранай справы.

Напрыканцы душпастыр заўважае, што было б добра наладзіць кантакты з медуніверсітэтам. “Адукацыя работнікаў службы аховы здароўя ў большасці

засноўваецца на «матэрыяльных» дысцыплінах: фізіялогія, анатомія, генетыка, – зазначае кс. Віталій. – Часам гэтыя прадметы вядуць да спакусы стаць няверуючым або ўмацавацца ў бязвер'і. Як мне здаецца, душпастырская апека будучых медыкаў вельмі неабходная".

18 кастрычніка – літургічны ўспамін св. Лукі, апекуна медыкаў. У гэты дзень у гродзе